Цэна асобнагонумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна также надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 15 марца 1913 г. №. 11.

## Хто страшней.

Ніхто ня быў прарокам у сваей Бацькаўшчыне,—кажэ старая прыказка. Вядзецца гэта і у нас.

На праўду, калі яе хто скажэ першы раз, усе глядзяць скоса. Ей ня вэраць. Людзям здаецца, што праўда павінна быць нейкая запутаная, а тым часам яна простая і ясная, як Божы дзень.

Гэткую праўду мы сказалі аб палітыцы, каторую нашы адміністратары вядуць на «окраінах», а ў тым ліку і ў Беларусі.

Мы паказалі на жывых прыкладах, што жаданьне завясьці расейскую мову ў касьцелі ды пры навуцы каталікоў-беларусоў рэлігіі ня толькі шкодна для беларусоў і забівае ў іх нацыональную сьвядомасць, але і памагае іх апалячываць. Беларус-каталік ахватней будзе маліцца па польску, бо да гэтаго прывык, чым па расейску, калі яму забараняюць маліцца і вучыцца па беларуску. Гэта паказалося і пры школьнай перапісцы у 1911 гаду, і цяпер, калі міністр народнай прасьветы, Кассо, выдаў цыркуляр, каб кожнаго, хто лічыць сябе беларусам, вучылі-бы веры па расейску, ня гледзячы на Маніфэст 17 апрыля 1905 году аб навуцы рэлігіі у *роднай* мові вучнёў.

Але гэтаго нашым «апекуном» было мала. Розные Солоневічы, Ковалюкі, Тепловы і іншые «прыяцелі» беларускаго народу с чорнасоценнай хаўрузіі зразумелі, што як беларус будзе вучыцца па своему—*па беларуску*, як яго мова знайдзе сабе прыпынак у школі, дык нельга будзе дурыць людзям галаву, што ніякіх беларусоў німа, што яны ўсё—„чыстакроўные расейцы“, што іх родная мова *не беларуская, а расейская.* Нашы тутэйшые «прыяцелі» заплюшчылі вочы на тое, што кассоўскі цыркуляр прымушае каталікоў-беларусоў запісывацца палякамі, хаця яны вельмі часта зусім і гутаркі польскай ня знаюць.

Усё ж такі дачуліся аб гэтым пецярбурскіе націоналісты. Калі Тепловы, Солоневічы ды Ковалюкі гатовы аддаць беларусоў-каталікоў палякам, а сабе ўзяць праваслаўных дзеля абрусеньня,—дык пецярбурскіе іх хэўруснікі баяцца узмацаваньня польшчыны ня менш, чым беларушчыны. Думалі яны, думалі, што тут зрабіць: дрэнна, калі беларусы апалячываюцца, але так сама ня добра, калі яны хочуць астацца беларусамі ды адмаўляюцца перэварачывацца ў расейцоў.

Каб разабраць гэту справу, газэта пецярбурскіх націоналістоў, „Нов. Вр.“, паслало ў Вільню свайго супрацоўніка. Той, прыехаўшы сюды, відаць дрэнна угаварыўся с тутэйшымі сябрамі ды неўспадзеўкі напісаў у „Нов. Вр.“ стацьцю, ў каторай, ня гаедзячы на увесь страх перад беларускім „сэпаратызмам“ радзіць не заганяць беларусоў у абоймы польскіх націоналістоў а лепш ужо—хаця з болем у сэрцы—пазволіць вучыцца ў школах рэлігіі ды маліцца ў касьцелі па своему—па беларуску.

Цікавая справа, што на гэта скажуць Ковалюкі ды Солоневічы, „быўшые беларусы“? Гэта-ж ім зусім хлеб адбіраюць—і хто? Іх сябры...

Мы ведаем, што «Нов. Вр.» гэтакі самы вораг беларушчыны. як «Вил. Вѣстн.», „Сѣв.-Зап. Жизнь“, ды «Крестьянинъ» ковалюкоўскі. І гэты праект „Нов. Вр.“ тлумачыцца адно тым, што палякі паказаліся пану Реннікову, супрацоўніку «Нов. Вр.» і ў гэты момэнт больш «небаспечнымі», чым беларусы. Калі-ж між расейскімі і польскімі націоналістамі ізноў наладзіцца згода каторая цяпер крыху папсавана, дык яны з двух бакоў пойдуць вайной проці беларушчыны.

Мы гэта павінны памятаць. Адраджэньне беларусоў, гэта для іх такая ненавістная справа, што дзеля змаганьня з ею яны раней чы пазней пададуць сабе рукі.

Б. С.

## На добры шлях.

Добра ідуць усе справы у тэй старонцы, дзе творчая, культурная работа вядзецца адзінакава як з нізу, так і зверху. Дзе сам народ дайшоў думкі, што ня можна яму адставаць, ня можна сваіх патрэб зневажаць, а трэба як мага і скольхі сілы прасьвячацца, на шырэйшую сьцежку выбівацца. Дзе сам народ такой думкі, ды бярэцца ён за прасьвету, за кніжку, па новаму сваю гаспадарку і свой грамадзкі лад устанаўляе,—там ён і багацее і лягчэй яму, ды шчасьлівей жывецца.

А ешчэ трэба, каб і зверху, ад інтэлігенцыі была помач такім работнікам з народу. Там дзе інтэлігенцыя зліваецца з народам, мае адну з ім культуру і мову, то яна ня стрымлівае развіцьце народу, а шчыра памагае яму усімі сіламі развівацца дзелятаго там, і развіцьце старонкі ідзе. Гэтак сама для здаровага развіцьця кожнаго краю патрэбны і добрые законы, добрае земства, добрые парадкі,—дзе усё гэта ёсць там, і ўсякая справа робіцца лягчэй і не чуваць жалёў ды нарэканьня на благіе часы і ўсякіе перашкоды.

У нас на Беларусі, як і скрозь па Расеі йшчэ німала пачуеце бедаваньня на трудные варункі. У міншчыне, могілеўшчыне, вітэбшчыне нарэкаюць на земства, што яно не здаволівае запраўдных селянскіх і национальных Беларускіх патрэб; у Віленшчыне і Гродзеншчыне ешчэ больш нарэкаюць, бо тут німа ніякага земства і куды меней робіцца для карысьці хлебаробоў. Нарэкаюць людзі і на Думу, на законы, што яны раз пораз адстаюць ад жыцьця ды йшчэ назад, не наперад, яго спіхаюць. І калі з нізу народнай массы можна бачыць кірунак да прасьветы, да лепшаго, культурнейшаго жыцьця,—то тым горш кідаецца у вочы тое стрымліваньне ды безладзьдзе, каторае вынікае праз недахват добрых, цьвёрдых законаў.

На жаль гэтая атсталасць нашых законоў дужа памалу зменяецца.

Хоць ось ўжо і чацьвёртая Дума увайшла у сілу і ў ей падалі колькі праектоў новых законоў, каторые блізка датычаць селянскаго жыцьця, але ўсё гэта разглядаецца, „як мокрае гарыць“. Йшчэ ў трэцюю Думу само правіцельства было падаўшы праект закону, каб аблягчыць селянам купляць на льготных варунках казённую зямлю. Ды за 5 гадоў Дума не прыбралася гэты закон прагледзіць бо, мабыць ей, гэты закон. ні падабаецца... Гэтак сама і ў Гас. Савеці цяпер ось разглядаецца справа аб валасным земстві, як яго можна устанавіць і ці патрэбнае яно. І непрыемна чытаць размовы паноў членоў Гас. Рады, як яны закон гэты хочуць жыўцом пахаваць...

Толькі у самы апошні час і ў селянскім жыцьці ёсць колькі навінак, што радуюць сэрцэ. У думі згуртаваліся у асобную грамадку дэпутаты-селяне і высовываюць цэлы рад праектоў і запросоў. Тут і зямельные законы, і прасьвета і раскладкі ды налогі, і законы грамадзянскіе, і аб хаўрусах ды інш. Гэта грамадка з дэпутатоў ня дужа вялікая (57 чэлавек), але яна жывая, працавітая і ўзялася бараніць інтэрэсы тых селян, што іх паслалі у Думу. Гэтае выступленьне дэпутатоў селян трэба толькі вітаць і радавацца. Добра было-б, каб пасылалі ім з вёсак парады, наказы, калі дзе што трапіцца такога, што трэба было б бараніць дзеля карысьці селян у Думе.

Р.

## Выстаўка народнаго штукарства.

Нідаўна аткрыўшаеся у Вільні «Таварыство падмогі хатняму рэмяслу і народнаму штукарству», у нядзелю, 10 марца аткрыло выстаўку у школі штукарства (Завальвая 21). На выстаўцы ёсць шмат народных беларускіх і літоўскіх выробоў: паяскоў, тканін, выробоў з дрэва, гліны і інш. Выстаўка робіц прыятнае ўражэньне, хоць і не залішне яна абшырна. У гэтым прыпадку важна тое, што у канцы знайшліся у нас людзі каторые звярнулі увагу на хатняе рэмясло і на народнае штукарства.

У вялікарасейскіх губэрнях, селяне знаходзяцца, бадай, у горшых чым нашые варунках і вось там даход с хатняго рэмесла яўляецца вялікай падмогай селянам, каторые з яго маюць нязгоршы даход, седзючы у сябе дома, а ня глумячыся па чужых краёх, як нашы беларусы. Якіе грошы перэліваюцца селянам за выробы хатняго рэмесла можна судзіць ужо с таго, што на адным толькі Ніжэгародзкім кірмашы прадаюць выробоў хатняго рэмесла на 21 мільён рублёў. Праўда, у вялікарасеі над развіцьцем хатняго рэмесла колькі дзесяткоў гадоў ужо працуюць земствы і правіцельство, памагаючы чым можна рэмесьнікам. У нас земства німа, дык яго мейсца павінны заступіць лепшые людзі нашаго краю.

Дагэтуль ніхто у нас ня рупіўся аб селяніне, як ён і чым жыве; наадварот, чужая нацыанальна інтэлігенцыя у Беларусі соткі гадоў працавала над тым, каб у галаве селяніна беларуса на усё яго роднае вырабіць пагляд, што гэта нешта бездарнае, грубое, адным словам—мужычае, а затым нікуды ня годнае. Пры гэткіх варунках хутка вымірало усё сваё арыгінальнае, уступаючы мейсцо фабрычнай тандэці, каторая у вачах селяніна была «панскім», а затым лепшым ад ягонало мужычаго. У Польшчы, у Вялікарасеі, дзе інтэлігенцыя нацыональна свая, народнае штукарства, народны рысунак шанаваўся і пераховываўся. З гэтых народных рысункоў укладаюць цяпер там, багатые узоры да новых выробоў хатнім рэмесьнікам.

Новае таварыство падмогі хатняму рэмяслу і штукарству, будзе тады толькі карысна працаваць для краю, калі у ём знойдуцца людзі звязаные з народам, каторые будуць з любоўю ды знаньнем класьці сваю працу на развіцьце у нас народнаго штукарства. Дарсга-ж да развіцьця хатняго рэмесла усюды адна—арыгінальны народны рысунак. Калі нашы рэмесьнікі селяне будуць выраблядь рэчы формай і рысункам арыгінальные, тады на іх збыт знойдзецца ня толькі у нашым краю, але і далёка па за яго граніцамі. Калі ж рэмесьленные выробы будуць толькі менш, або больш гладкай падробкай фабрычных выробоў, то наш рэмесьнік конкурэнціі с фабрычнай машынай і капіталам ня вытрымае і хатняе рэмясло замрэ на заўсёды. Дзеля гэтаго вітаючы ад усяго сэрца аткрыцьце першай выстаўкі у нашым краю хатніх выробоў, якую устроіло Таварыство, мы усё-ж такі звертаем яго увагу на тое, што тады толькі праца яго прынясе плады, калі яно паложыць у фундамэнт арыгінальны народны рысунак і будзе працаваць над тым, каб даць рэмесьнікам праўдзіва штукарскіе і орыгінальна мейсцовые модэлі на форму.

В. Л.

## Эміграцыя у Амэрыку.

У апошніе часы эміграцыя у Амэрыку страшэнна разрастаецца. Паводле статыстыкі у 1911 гаду праз Лібаву выехало заграніцу 35.047 душ (20.518 мужчын і 13.529 жанок). У 1912 гаду выехало 57.215 душ (38.769 мужчын і 18.446 жанок).

З гэтаго відаць, што эміграцыя шпарка павялічываецца. Але гэты год, мабыць, перавышыць чыслом эмігрантоў усе папяпэдніе.

За адзін прошлы тыдзень у Лібаву прыбыло ні болей, ні меней, як 6.000 эмігрантоў. Усе поезды Лібава-Роменскай жал. дарогі прост бітком набіты. Цяпер што дзень у Лібаву прыбывае 500 — 600 душ эмігрантоў.

Агромны эміграцкі дом—перапоўнен, так, што прост недзе яблаку зваліцца. Каля двох тыся душ прышлося памесьціць на версе марского парахода. Гарадзкіе казармы, прыспасобленые для эмігрантоў, гэтак сама перапоўнены. Для тых, што прыежджаюць не хапае мейсца на начлег. Па горадзі ходзяць грамады эмігрантоў. Паміж эмігрантамі найболей беларусоў, літвіноў і палякоў. Едуць яны у Паўночную Амэрыку. Німала ёсць і каўказцоў—осецінцоў, каторые едуць у Канаду на будову чугункі.

Едзе шмат людзей слабых, хворых, каторых напэўна ня пусьцяць на Амэрыканскі берэг. Дзеля гэтаго і чысло вертаючыхся эмігрантоў у апошніе гады вельмі узрасло. Кожны карабель вертаючыся з Амэрыкі прывозіць назад 300—400 душ эмігрантоў. Не глядзя на гэта эміграцкая хваля разрастаецца.

Гэты разрост эміграціі трэба прыпісаць розным агентам, каторые раз'ежджаюць па вёсках і сёлах і усякімі спосабамі і апаведаньнямі нагаварываюць лёгкаверных людзей на выезд. Агенты раздаюць розные адозвы і кніжкі з апісаньнем „багатаго амэрыканскаго жыцьця“; іншые агенты іграюць на слабой селянскай струнцы — на зямельнай справе і рысуюць небывалые рэчы аб тамтэйшай зямлі—абы толькі заманунць на выезд.

